Абітурыент-2019

# Ад сістэмы ранжыравання на ЦТ адмаўляюцца

**У 2019 годзе падчас прыёмнай кампаніі будзе ўведзена новая сістэма апрацоўкі вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання. Пра гэта ў інтэрв'ю БелТА паведаміла першы намеснік міністра адукацыі Ірына СТАРАВОЙТАВА.**

Яна расказала, што сёлета эксперыментальна, паралельна з наяўнай сістэмай апрацоўкі вынікаў ЦТ, апрабавалася і новая методыка. Пры той сістэме падліку балаў, якая дзейнічала з моманту ўвядзення ў нашай краіне цэнтралізаванага тэсціравання, вынік удзельніка залежаў ад таго, як справіліся з канкрэтным заданнем іншыя абітурыенты, і ўсе яны паміж сабой ранжыраваліся. Пры выкарыстанні новага падыходу для кожнага тэставага задання будуць вызначаны першасныя балы («вага заданняў»), пра якія абітурыенты даведаюцца загадзя. Гэтым, па словах першага намесніка міністра адукацыі, будзе забяспечвацца пэўная адкрытасць. Абітурыент па меры выканання заданняў зможа адразу спрагназаваць свае вынікі. І атрыманы будзе дакладна адлюструе рэальны ўзровень ведаў абітурыента па прадмеце. «Значыць, у пераважнай большасці ўдзельнікаў ЦТ гэтыя вынікі будуць набліжаны да выніковай атэстацыі ў школе, мы зможам убачыць іх карэляцыю і, адпаведна, якасць працы школьных педагогаў. Стабільная сістэма ацэнкі вынікаў на ЦТ захаваецца, складанасць заданняў таксама застанецца ранейшай, — запэўніла Ірына Старавойтава. — Змяненні закрануць толькі спосаб апрацоўкі вынікаў тэстаў. Як паказаў эксперымент гэтага года, Рэспубліканскі інстытут кантролю ведаў да работы ў новым фармаце гатовы, яны справіліся, збояў ніякіх не было. Мы параўналі вынікі эксперымента і ранейшай сістэмы. Наша выснова — новая методыка мае свае плюсы, яна досыць эфектыўная».

Надвор'е

# Да нас прыйшло «старое бабіна лета»

З пятніцы да нядзелі будзе цёпла, да плюс 20 градусаў

**На гэтым тыдні асноўны ўплыў на надвор'е ў нашай краіне будуць аказваць антыцыклоны. Усталюецца цёплае і ў асноўным без ападкаў надвор'е з тэмпературным фонам на 2—6 градусаў вышэйшым за кліматычную норму, паведамляюць спецыялісты Рэспубліканскага цэнтра па гідраметэаралогіі, кантролі радыеактыўнага забруджвання і маніторынгу навакольнага асяроддзя Мінпрыроды.**

У аўторак умовы надвор'я будзе вызначаць вобласць павышанага ціску. Аблокаў стане менш, і паветра ў дзённыя гадзіны пачне прагравацца. Будзе пераважна без ападкаў. Максімальная тэмпература паветра складзе 10—16 цяпла. І ў сераду на надвор'е паўплывае антыцыклон. Будзе без ападкаў. Уначы і раніцай месцамі магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе ад плюс 1 да плюс 8 градусаў, на тарфяніках Палесся месцамі чакаюцца слабыя замаразкі ад нуля да мінус 2 градусаў. Удзень будзе 13—19 цяпла.

Пагроза невялікіх замаразкаў захаваецца і ў чацвер. У гэты дзень будзе пераважна без ападкаў. Уначы і раніцай у асобных раёнах магчымы слабы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 2—9 цяпла, на тарфяніках Палесся месцамі чакаюцца слабыя замаразкі да нуля — мінус 2 градусаў. Днём тэмпература будзе знаходзіцца ў межах ад плюс 13 градусаў па паўночным усходзе да 20 цяпла па паўднёвым захадзе краіны.

Цяперашняе «старое бабіна лета» завітае да нас у пятніцу — нядзелю. З 12 да 14 кастрычніка будзе пераважна без ападкаў і цёпла. Уначы і раніцай месцамі магчымы туман. Тэмпература паветра ўначы складзе 3—8 цяпла, а ўдзень — ад плюс 13 да плюс 20 градусаў.

Другаснае пацяпленне, або бабіна лета, па навукова-народным тлумачэнні надыходзіць пасля значнага пахаладання і можа суправаджацца яшчэ адным цвіценнем некаторых раслін.

**Сяргей КУРКАЧ.**

Падзея

# ПРЫЕМНЫЯ МОМАНТЫ СЛУЖБЫ

**5 кастрычніка 2018-га — знакавая дата для Міністэрства ўнутраных спраў. Споўнілася 100 гадоў са дня ўтварэння крымінальнага вышуку.**

У гэты дзень падраздзяленням крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі быў уручаны сцяг, заснаваны загадам міністра ўнутраных спраў Ігара Шуневіча. Уручэнне адбылося на плошчы Дзяржаўнага сцяга пры ўдзеле кіраўніцтва ведамства і крымінальнага вышуку краіны, начальнікаў абласных упраўленняў міліцыі і ветэранаў.

— Гэты дзень, 100-годдзе крымінальнага вышуку, стане ў гісторыі міліцыі Беларусі яшчэ і ўнікальным святам, — адзначыў Ігар Шуневіч. — Падраздзяленням крымінальнага вышуку крымінальнай міліцыі ўручаны сцяг, які зойме асаблівае месца ў летапісе легендарнай службы. Сцяг для кожнага супрацоўніка стане сімвалам доблесці і гонару, напамінам аб гераічных традыцыях і абавязку супрацоўнікаў крымінальнага вышуку па абароне грамадзян ад злачынных замахаў.

Фота Таццяны ТКАЧОВАЙ.

Пасля таго як сцяг быў уручаны падраздзяленням крымінальнага вышуку, супрацоўнікі службы атрымалі дзяржаўныя і ведамасныя ўзнагароды за ўзорнае выкананне службовага абавязку, прафесійнае майстэрства, высокія паказчыкі ў аператыўна-службовай дзейнасці, значны асабісты ўклад кожнага ў справу барацьбы са злачыннасцю.

Адказваючы на пытанне, які ўклад унёс крымінальны вышук у нашу агульную бяспеку, Ігар Шуневіч адзначыў: «Крымінальны вышук краіны валодае велізарным вопытам, усім неабходным тэхнічным абсталяваннем для таго, каб адэкватна рэагаваць на ўсе выклікі і пагрозы крымінальнага свету».

Адна з удзельніц падзеі, **оперупаўнаважаны аддзялення крымінальнага вышуку Жодзінскага ГАУС капітан міліцыі Вольга КАРАЛЁВА,** на пытанне, якая на самай справе гэтая служба, адказала:

— Служба, як і ўсе іншыя ў міліцыі, і небяспечная, і цяжкая. Бываюць свае пытанні, свае нюансы. Але служба цікавая, працаваць можна і трэба. Вядома, бываюць розныя сітуацыі, калі даводзіцца няпроста. Але здараюцца і прыемныя моманты... як, напрыклад, сённяшні дзень.

**Сяргей КУЛАКОЎ.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Барселоне развіталіся з Мантсерат Кабалье



Сусветна вядомай іспанскай опернай спявачкі Мантсерат Кабалье не стала на 86-м годзе жыцця ў мінулую суботу ў Барселоне. Кабалье вядомая тэхнікай віртуознага спеву бельканта. Сваё імя атрымала ў гонар мясцовай святой гары, дзе знаходзіцца манастыр Святой Марыі Мантсерат. Сусветная слава прыйшла да спявачкі ў 1965 годзе, калі яна замяніла хворую амерыканскую оперную зорку Мэрылін Хорн у партыі Лукрэцыі Борджа ў нью-ёркскім Карнэгі-холе. Яе выступленне стала сенсацыяй, зала зладзіла 20-хвілінную авацыю. Усяго Кабалье выканала каля 125 оперных партый і выпусціла больш за сотню дыскаў. У 1988 годзе разам з лідарам гурта Queen Фрэдзі Мерк'юры запісала альбом Barcelona, загалоўная песня з якога, створаная да Алімпійскіх гульняў 1992 года, у выніку стала сімвалам Барселоны і ўсёй Каталоніі. Грамадзянская паніхіда адбылася ў цэнтры пахавальных рытуалаў Лес-Кортс. Спявачку пахавалі на могілках Сан-Андрэа побач з бацькамі. Бывайце, сеньёра Кабалье...

## Саўдаўскі прынц прадказаў сыход ключавых гульцоў з рынку нафты

Наследны прынц Саўдаўскай Аравіі Мухамед бен Салман Аль Сауд заявіў, што ў будучыні большасць вытворцаў нафты знікне з сусветнага рынку. Пра гэта ён расказаў у інтэрв'ю Bloomberg. У прыватнасці, на думку прынца, здабыча гэтага віду сыравіны скароціцца ў Расіі. «Праз 19 гадоў вытворчасць нафты ў Расіі моцна скароціцца, калі не знікне зусім, з яе 10 мільёнамі бараляў», — растлумачыў Аль Сауд. Акрамя гэтага, саўдаўскі прынц прадказаў сыход Кітая з сусветнага рынку нафты прыкладна праз пяць гадоў. Паводле яго слоў, іншыя вытворцы сыравіны таксама будуць «знікаць кожны дзень».

Нягледзячы на гэта, попыт на нафту будзе расці да 2030 года больш чым на адзін працэнт у год, таму Саўдаўская Аравія ў будучыні павінна павялічыць пастаўкі. Раней Мухамед Аль Сауд заявіў, што каралеўства не будзе плаціць ЗША за сваю бяспеку. Ён дадаў, што пагадненне Эр-Рыяда і Вашынгтона дазваляе Саўдаўскай Аравіі вырабляць зброю па амерыканскай тэхналогіі і гэта добрае дасягненне як для Белага дома, так і для арабскай краіны.

## У Кітаі пацвердзілі затрыманне зніклага прэзідэнта Інтэрпола, яго падазраюць у карупцыі

Колішні прэзідэнт Інтэрпола Мэн Хунвэй знаходзіцца пад следствам у Кітаі па падазрэнні ў хабарніцтве. Пра гэта гаворыцца ў заяве міністэрства грамадскай бяспекі краіны. Як адзначаецца, расследаванне паказвае, што ніякіх выключэнняў у законе для чыноўнікаў не існуе. У міністэрстве таксама паведамілі, што неабходныя дзеянні правядуць і ў дачыненні да саўдзельнікаў чыноўніка. Раней СМІ паведамілі, што мужчына нібыта аказваў садзейнічанне кампаніі, якая працуе ў сферы барацьбы з кіберзлачынніцтвам, пры атрыманні кантрактаў. Прэзідэнт Інтэрпола падаў у адстаўку, і гэтая просьба задаволена. Выконваць яго абавязкі да новых выбараў у лістападзе будзе старшы віцэ-прэзідэнт Кім Чэн Ян з Паўднёвай Карэі. Як вядома, 64-гадовы Мэн Хунвэй 29 верасня адправіўся з Францыі ў Кітай і з тых часоў не выходзіў на сувязь. За некалькі гадзін да знікнення ён даслаў жонцы фота нажа.

ФАКТЫ ПАДЗЕІ НАВІНЫ

# Падсяліць сома і ліня

**Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў (БТПР) у кастрычніку — лістападзе плануе правесці зарыбленне 11 вадаёмаў краіны.**

Гэта працяг мерапрыемстваў па аднаўленні рыбных рэсурсаў у Беларусі. У праватнасці, запланавана правесці зарыбленне вадасховішчаў Вялута, Княжабор'еўскае, Свіднае, Зэльвенскае, Ляўкі, Гарэніцкае, Рудзея, азёр Лучай, Мугірына і іншых.

Беларускае таварыства паляўнічых і рыбаловаў з 2014 года праводзіць мерапрыемствы па ўзнаўленні рыбных рэсурсаў у рыбалоўных угоддзях фонду запасу. З 2014-га па 2018 год праведзена зарыбленне звыш 50 сацыяльна значных вадаёмаў краіны: вадасховішчаў Заслаўскага, Чыгірынскага, Пятровіцкага, Рудзеі, Пцічы, Вячы, Салігорскага, Чырвонаслабодскага, Мышанкі, Лепельскага возера, Дняпра, Прыпяці і іншых. Штогод у вадаёмы краіны ўсяляецца каля 30 тон або звыш 100 тысяч асобін розных відаў рыб, у тым ліку шчупакоў, сома, ліня, карпа, белага амура.

Як адзначылі ў БТПР, зарыбленне скіравана на аднаўленне рыбных запасаў, паляпшэнне відавога складу іхтыяфаўны вадаёмаў, а таксама на задавальненне рэалізацыі права на бясплатнае аматарскае рыбалоўства ўсіх без выключэння грамадзян краіны.

# Загінула пад камбайнам

**Пенсіянерка загінула на кукурузным полі ў Дзяржынскім раёне.**

Здарэнне адбылося днём каля вёскі Ярошаўка. Па інфармацыі афіцыйнага прадстаўніка УСК па Мінскай вобласці Таццяны Беланог, механізатар, кіруючы кормаўборачным комплексам, здзейсніў наезд і смяротна траўмаваў 80-гадовую мясцовую жыхарку, якая знаходзілася на ўборачным участку. Акалічнасці таго, што адбылося, устанаўлівае Дзяржынскі раённы аддзел Следчага камітэта. На месцы здарэння знойдзена сумка з кукурузай, адабраны прадметы, зафіксаваны сляды. Па выніках першапачатковых следчых дзеянняў заведзена крымінальная справа за парушэнне правілаў дарожнага руху або эксплуатацыю транспартных сродкаў, што пацягнула па неасцярожнасці смерць чалавека.

Следчыя нагадваюць аб мерах бяспекі пры знаходжанні старонніх асоб на полі падчас сельскагаспадарчых работ, у якіх задзейнічана тэхніка.

**Сяргей РАСОЛЬКА.**